## Тлумачальная запіска

Раздзел “Першая сусветная вайна” вывучаецца ў 9 класе ў канцы курсу сусветнай гісторыі. Вучэбная праграма прадугледжвае на вывучэнне дадзенай тэмы два ўрокі: “Прычыны вайны і ход ваенных дзеянняў у 1914 – 1916 гг.” і “Найважнейшыя падзеі і ход ваенных дзеянняў у 1917 – 1918 гг.”. Прапануемая распрацоўка тэмы грунтуецца на некалькі іншым ад праграмнага падыходзе да вывучэння Першай сусветнай вайны. Першы ўрок – “Прычыны вайны і ход ваенных дзеянняў у 1914 – 1916 гг. Найважнейшыя падзеі і ход ваенных дзеянняў у 1917 – 1918 гг.” прадугледжвае вывучэнне ўсёй тэмы на храналагічна-падзейным узроўні; на другім уроку – “Першая сусветная вайна ў гісторыі чалавецтва” ідзе замацаванне і паглыбленне вывучанага матэрыялу на праблемным узроўні, яго асабістае пераасэнсаванне кожным вучнем, робіцца эмацыянальна-гуманістычны акцэнт, а таксама ажыццяўляецца кантроль ведаў па тэме.

Дадзеная распрацоўка прадугледжвае прымяненне разнастайных форм, метадаў і прыёмаў навучання, што дазволіць мяняць віды дзейнасці, ствараць сітуацыі, павышаючыя матывацыю вучняў, павысіць іх працаздольнасць. Так, тэхналогія перамяшчэння вучняў спрыяе таму, што вучні пастаянна знаходзяцца ў руху, трапляюць у новыя сітуацыі, няспынна знаходзяцца ў стане пошуку. Элементы дыскусіі прымяняюцца з мэтай фарміравання ў вучняў уласнай пазіцыі, развіцця ўменняў аргументавана абараняць свой пункт гледжання. Методыка “Брэйн-рынгу” выкарыстоўваецца, каб, з аднаго боку, вучні пераключыліся з вучэбнай на гульнявую дзейнасць, а з другога – актуалізавалі ўласныя ўменні лагічнага мыслення, каманднага пошуку на пастаўленае пытанне і, разам з тым, знаходзіліся ў межах вывучаемай тэмы. Такая размінка дазваляе актывізаваць інтэлектуальныя здольнасці вучняў, навыкі лагічнага мыслення, што вельмі важна перад ажыццяўленнем кантролю ведаў.

Пры распрацоўцы ўрокаў неабходна было ўлічыць, што ў курсе гісторыі Беларусі ў другім паўгоддзі будзе вывучацца звязаная з разглядаемай тэма “Падзеі Першай сусветнай вайны на беларускіх землях” і таму неабходна падрыхтаваць глебу для яе вывучэння шляхам надання вучням апераджальных заданняў.

Для аптымізацыі адукацыйнага працэсу на ўроку рапрацавана мультымедыйная суправаджальная прэзентацыя ў праграме Microsoft PowerPoint. З яе дапамогай рэалізуецца прынцып нагляднасці навучання, прэзентацыя насычана картаграфічным, ілюстратыўным матэрыялам.